с 914

Д42

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ

УДК 930.8 (476)

**СУХОЦКАЯ Таіса Фёдараўна**

# ТЫПЫ І ФОРМЫ УТОПІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ (НА МАТЭРЫЯЛАХ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ І МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XVI-XX СТСТ.)

**24.00.01 - тэорыя і гісторыя культуры**

***Аўтарэферат дысертацыі***
***на атрыманне вучонай ступені кандыдата культуралогіі***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск - 2002**

835 ... 7, 73, 3-3-р 44 +60 31 (4) ЗЕМ) 5 Р4
С 914

Праца выканана на кафедры тэорыі і гісторыі культуры
Установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Навуковы кіраўнік — кандыдат філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка» **Рагуля А.У.**

Афіцыйныя апаненты — доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры сацыялогіі і культуразнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры **Дарашэвіч Э.К.**

кандыдат культуралогіі кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта **Вараб'ёва І.У.**

Апаніруючая арганізацыя — Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»

Абарона адбудзецца 6 чэрвеня 2002 г. у 14.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.02 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры па адрасу: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, ауд. №231, тэл. вучонага сакратара 222-80-25.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

Аўтарэферат разасланы 6 мая 2002 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат культуралогіі — Э.А.Усоўская



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Вырашэнне пастаўленых задач дысертацыі дазваляе дакладна акрэсліць стан даследаванасці тыпаў і формаў утопіі, вызначыць іх месца і ролю ў сучасным гісторыка-культурным працэсе і тым самым актуалізаваць духоўны патэнцыял жанравых формаў.

Праца праблематычна звязана з тым напрамкам у сучаснай культуралогіі, на якім даследуецца утопія, яе вытокі, станаўленне і развіццё, тыпалогія, мастацкая структура. Аднак у беларускай культуралогіі нацыянальная утопія не была аб'ектам спецыяльнага даследавання.

У беларускай навуковай традыцыі неаднаразова разглядаліся такія формы утопіі як ідылія і "казкі жыцця", закранаюцца рысы антыутопіі – своеасаблівай формы утопіі, якая ва ўмовах таталітарных рэжымаў становіцца сродкам выкрыцця дэгуманізаванай рэчаіснасці і перарастае ў самастойную жанравую форму. Айчынныя даследчыкі разглядалі антыутапічныя творы з пункту гледжання адпаведнасці іх структуры класічнай жанравай форме. Увага замежных літаратуразнаўцаў ў асноўным засяроджваецца на знешніх фармальных прыкметах і сацыяльнай функцыі антыутопіі. Пры такім падыходзе магчымасць пазнання жанравай спецыфікі антыутопіі, структурных асаблівасцей і яе функцыі раскрываюцца не ў поўнай меры.

Пры ўсёй цікавасці да утопіі і антыутопіі на дадзены момант яшчэ няма буйных, абагульняючых работ па тэорыі і гісторыі беларускай утопіі.

Дадзеная дысертацыя з'яўляецца першым спецыяльным даследаваннем тыпалогіі і формаў утопіі ў беларускай культуры. У працы раскрываецца роля утапічнага мыслення ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, формаў утопіі – у абнаўленні эпічнай формы. Гэтым самым пашыраецца ўяўленне пра дзейсны пачатак нацыянальнай культуры, пра асаблівасці беларускага менталітэту. На гэтым шляху адкрываюцца новыя перспектывы гісторыка-тыпалагічнага аналізу, больш цеснага ўзаемадзеяння агульнай культуралогіі з прыватнымі яе галінамі.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя з'яўляецца спецыяльным даследаваннем адной з важнейшых праблем тэорыі і гісторыі культуры і цесна звязана з уключанай у дзяржаўны план навуковых даследаванняў тэмай "Духоўная культура беларусаў у кантэксце славянскай супольнасці" (2001-2005).

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
Інв. N
РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта даследавання – выяўленне значэння, сутнасці, спецыфікі тыпаў утапічнага мыслення і жанравых формаў утопіі ў беларускай культуры. Дзеля яе дасягнення неабходна вырашыць наступныя задачы:

- вызначыць асноўныя напрамкі ў сучаснай тэорыі утопіі і прааналізаваць узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць паміж утопіяй і антыутопіяй;
- ахарактарызаваць спецыфічныя рысы беларускай утопіі;
- раскрыць сацыяльныя функцыі утопіі і антыутопіі;
- вызначыць тыпаж і хранатоп антыутопіі;
- вызначыць ролю утопіі і антыутопіі ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

**Аб'ект і прадмет даследавання**. Аб'ектам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца утопія ў матэрыялах беларускай грамадскай думкі і ў творах мастацкай літаратуры XVI-XX стст.

Прадмет даследавання – працэсы станаўлення і развіцця утопіі як тыпу мыслення і літаратурнай формы яе выражэння ў грамадскай думцы і мастацкай літаратуры.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** У якасці асноўных выкарыстоўваюцца агульнанавуковыя метады аналізу, сінтэзу, сістэмнага падыходу ў адзінстве са спецыяльнымі: гісторыка-тыпалагічным, параўнальна-гістарычным, герменеўтыкі. Комплесны падыход забяспечвае больш шырокія магчымасці ў раскрыцці культурнай семантыкі вывучаемай праблемы. Практычнае прымяненне метадаў гісторыка-тыпалагічнага, параўнальна-гістарычнага, метаду герменеўтыкі знайшло адлюстраванне ў працах замежных і айчынных культуролагаў, філосафаў, сацыёлагаў, літаратуразнаўцаў. Абагульненне анталагічнага зместу дазволіла акрэсліць тыпы, формы і сацыяльныя функцыі утопіі.

Аўтар дысертацыі абапіраецца на палажэнні і прынцыпы аналіза утопій, распрацаваныя ў даследаваннях Э.Баталава, В.Чалікавай, В.Шастакова, Е.Шацкага. У аснове работы ляжыць прынцып адзінства гістарычнага і лагічнага ў гісторыка-культурным працэсе.

У якасці навуковай тыпалогіі утапічнага мыслення выкарыстана класіфікацыя, прапанаваная К.Мангеймам - з пэўнымі ўдакладненнямі.

**Гіпотэза.** Утопія як тып мыслення і і літаратурная форма з'яўляецца важным кампанентам менталітэту, адлюстраванага ў мастацкай культуры і грамадскай думцы, уплывае на нацыянальную свядомасць і сацыяльную



актыўнасць, адыгрывае істотную ролю ў фарміраванні соцыума і асобы як суб'ектаў культуры.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя ўтрымлівае шэраг новых палажэнняў:

- упершыню нацыянальная утопія з'яўляецца аб'ектам спецыяльнага даследавання;
- удакладняецца навуковая тыпалогія утапічнага мыслення;
- вызначаны характэрны тып утапічнага мыслення беларусаў як кансерватыўна-ахоўны;
- раскрыты традыцыйныя і наватарскія асаблівасці беларускай утопіі (ідыліі, "казкі жыцця", антыутопіі), яе роля ў фарміраванні сучаснай аксіялогіі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Практычная каштоўнасць дысертацыі заключаецца ў тым, што яе вынікі могуць быць выкарыстаны ў фарміраванні зместу і структуры вучэбна-педагагічнага працэсу вышэйшай і сярэдняй школы, культуралагічнай адукацыі, што з'яўляецца актуальным для сучаснай рэформы школы.

Работа можа паслужыць тэарэтычнай базай для далейшага даследавання па праблеме утопіі і пры вывучэнні гісторыка-культурнага працэсу.

Апублікаваныя вынікі дысертацыі сталі асновай для напісання студэнтамі курсавых, дыпломных прац, выкарыстоўваюцца аўтарам у якасці інфармацыйнай і метадалагічнай асновы пры падрыхтоўцы студэнтаў на факультэтах народнай культуры і беларускай філалогіі і культуры ў рамках курсаў "Тэорыя і гісторыя культуры", "Культуралогія", "Гісторыя беларускай культуры" і "Мастацкая культура Беларусі".

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.** На абарону выносяцца наступныя палажэнні дысертацыі:

1. Зыходзячы са спецыфікі нацыянальнага гісторыка-культурнага працэсу, удакладняецца тыпалогія утапічнага мыслення. Замест прапанаваных К.Мангеймам чатырох тыпаў (аргіястычна-хіліясцкага, ліберальна-гуманістычнага, кансерватыўнага, сацыялістычна-камуністычнага) уводзіцца тры: сацыялістычна-камуністычны тып разглядаецца як састаўны кампанент аргіястычнага хіліязму.
2. Працэс фарміравання інтэграванай жанравай формы утапічнага мыслення (антыутопіі) у беларускай літаратуры адбываецца ў XX стагоддзі.
3. Характэрнай рысай нацыянальнага менталітэту з'яўляецца кансерватыўна-ахоўны тып утапічнага мыслення.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

4. Раскрыццё творчага патэнцыялу суб'екта з'яўляецца галоўнай функцыяй беларускай утопіі і антыутопіі.
5. У беларускай утопіі і антыутопіі сфарміраваўся змястоўна мабільны хранатоп, прасякнуты дынамікай станаўлення духоўнай культуры. Утопія і антыутопія сталі сродкамі далейшага развіцця нацыянальнай самасвядомасці, фарміравання пачуцця ўласнай годнасці асобы, здольнасці да паглыбленага спасціжэння гісторыі.

**Асабісты ўклад прэтэндэнта.** Увесь аб'ём даследаванняў па тэме выкананы аўтарам самастойна. У дысертацыі ўдакладняецца вызначэнне паняцця "утопія", акрэслены напрамкі тэарэтычнага даследавання тыпалогіі і жанравых формаў утопіі, іх сацыяльныя функцыі, атрыманы навукова абгрунтаваныя характарыстыкі формаў беларускай культуры – утопіі і антыутопіі, устаноўлены крытэрыі размежавання жанравых формаў утопіі і ідыліі, утопіі і "казак жыцця", антыутопіі ў мастацкай літаратуры. У навуковы ўжытак па праблеме утопіі ўведзены вялікі пласт мастацкай літаратуры ў інтэграцыі з грамадскай думкай.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя тэарэтычныя палажэнні дысертацыі і вынікі даследавання выкладзены ў выступленнях на двух міжнародных кангрэсах "Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя" (Мінск, 1998, 2000), міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Асоба і творчасць А.Міцкевіча ў кантэксце сусветнай літаратуры" (Брэст, 1998), рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях "Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа" (Мазыр, 1998), "Обществоведение в системе современного высшего образования: новые концепции, подходы в теории, методологии и методике преподавания" (Минск, 1999).

Асобныя раздзелы дысертацыі, як і ўся работа ў цэлым, былі абмеркаваны на пасяджэнні кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ.

**Апублікаванасць вынікаў**. Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў дзевяці навуковых артыкулах, тэзісах, матэрыялах выступленняў на навуковых кангрэсах і канферэнцыях. Агульны аб'ём – 53 с.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння. Агульны аб'ём дысертацыі 104 с. машынапіснага тэксту. Бібліяграфія ўключае 198 назваў.



## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы дысертацыі, раскрываецца ступень распрацаванасці праблемы.

Першая глава дысертацыі **"Утопія як тып мыслення і жанравая форма ў мастацкай літаратуры"** даследуе тэорыю, гісторыю, дынаміку жанравай формы утопіі.

У раздзеле 1.1. ***"Праблема утопіі ў сучаснай гуманітарыстыцы"*** раскрываецца сэнс паняцця утопіі, удакладняецца прадмет даследавання, даецца тыпалогія утопій, паказваецца ўзаемаабумоўленасць утопіі і антыутопіі, характарызуюцца напрамкі тэарэтычнага даследавання утопіі.

Даследаваннем утопіі сёння займаюцца розныя галіны гуманітарыстыкі: філасофія, сацыялогія, псіхалогія, літаратуразнаўства, культуралогія і інш. У тэорыі утопіі ў ХХ стагоддзі склаліся два асноўныя напрамкі. Пераважная большасць даследчыкаў (К.Мангейм, Э.Блох, Е.Шацкі, А.Свентахоўскі, М.Вебер) успрымаюць утопію як тып ці лад мыслення, пэўныя адносіны да жыцця, выражаныя ў форме тэксту.

У літаратуразнаўстве ў адпаведнасці з традыцыяй засяроджваецца ўвага на жанравай спецыфіцы утопіі (Н.Фрай, М.Хілегас, Б.Ланін, Ч.Уэлш, А.Мортан, Л.Хабібуліна, Г.Марсон, Г.Гюнтэр і інш.). Пры гэтым, аднак, не даецца выразнай дэфініцыі гэтага жанра.

Культуралогія стаіць перад неабходнасцю інтэграванага падыходу да вывучэння утопіі.

Літаратурная утопія выпрацавала сваю ўстойлівую сістэму ўмоўнасцей, уздзейнічае на свядомасць і паводзіны людзей праз вобразную сістэму. У гэтай жанравай формы ёсць уласныя законы: форма выказвання– не адцягненыя, а "размаўляючыя малюнкі"; апісанне вялікай колькасці рэчаў, прадметаў; апавяданне вядзецца ад імя трэцяй асобы, якая незвычайным шляхам пабывала ў краіне Утопіі; статычныя структуры, наўмысны дыдактызм і нагляднасць. Жыццё будуецца па законах рытуалу, але з дапамогай "каго-небудзь" падарожнік пачынае разумець яго рацыянальнасць. Гіпербалізуецца духоўны пачатак, акцэнтуецца ўвага на навуцы, мастацтве, выхаванні і іншых фактарах культуры. Адсутнасць свабоды выбару, свабоды асобы ва утопіях перакрэслівае магчымасць чалавека быць шчаслівым. У залежнасці ад светапоглядных арыетацый гістарычнай эпохі утопія можа выконваць процілеглыя функцыі. Напрыклад, "Утопія" Т.Мора была ідэалам будучага грамадства, а ў сучасным прачытанні яе казарменныя радасці – сапраўдная антыутопія.

Пры ўсёй разнастайнасці утапічнага мыслення застаецца нязменнай яго стрыжнявая структура – канструкцыя сацыяльнай схемы, якая зробіць усіх шчаслівымі. Адметным адрозненнем утопіі ад навуковай фантастыкі будем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыць уключэнне апісання сацыяльнай будовы утапічнага грамадства. Прызнаючы несумненную каштоўнасць існуючых характарыстык утопіі, трэба адзначыць, што ўсе яны недастаткова ўлічваюць феномен нацыянальнага адраджэння Навейшага часу. Даследчыкі разглядалі утопію пераважна ў яе дачыненні да нейкай галіны навукі ці грамадскай тэорыі. У дысертацыі сутнасць утопіі, яе значэнне раскрываецца як тып мыслення і як пэўная жанравая форма: утопія - *гэта ідэальная канструкцыя, змест якой складае інтэнцыя да ўдасканалення грамадства ў адпаведнасці з пэўнай сістэмай каштоўнасцей.*

Пры разглядзе тыпалогій упопій увага акцэнтуецца на самых папулярных класіфікацыях: Ф.Манюэля, В.Волгіна, Е.Шацкага. і інш. Мэтазгодна вылучыць сістэму Л.Мэмфорда. Даследчык засяродзіў увагу на "утопіі ўцёкаў" і "утопіі рэканструкцыі". Тыпалогія утопій, прапанаваная К.Мангеймам, сёння трактуецца як "класічная". Ён вылучае чатыры тыпы ў развіцці утапічнага мыслення: аргіястычны хіліязм, ліберальна-гуманістычную ідэю, кансерватыўную ідэю, сацыялістычна-камуністычную ідэю. Апошняя разглядаецца як мадыфікацыя аргіястычнага хіліязму на падставе агульнасці ўстановак на рэвалюцыянарысцкі эсхаталагізм.

Грамадская думка на пачатку XX стагоддзя імкнецца вызваліцца ад ілюзій. Рашаючую ролю ў станаўленні пазітыўных адносін да утопіі адыграла небяспека татальнага вынішчэння. Ідэалы сацыяльнага і гуманнага калектывізму ў гэтым кантэксце ўспрымаюцца не як гульня фантазій, а як адзіная альтэрнатыва крываваму хаосу. Адначасова пераглядаецца гісторыя утапічнай думкі, пераацэньваюцца старыя трактаты і раманы пра ідэальнае грамадства. Даследчыкі бачаць у іх ужо не рэлікты бяздумных надзей, а перадумовы "новага мыслення" XXI стагоддзя. Формай выкрыцця антыгуманнай сутнасці сацыяльных тэхналогій у XX ст. становіцца антыутопія. Яна не скіравана супраць утапічных ідэй. Яе мэта – паказаць, да чаго можа прывесці штучная рэалізацыя іх у жыцці. Вырашэнне праблем утопіі паказвае, што суіснаванне утопіі і антыутопіі сёння ўспрымаецца як неабходная ўмова гнасеалагічнай раўнавагі. Істотным дасягненнем сучаснай гуманітарыстыкі з'яўляецца раскрыццё сутнаснага, сэнсатворнага зместу утапічнага мыслення ў розных відах культуры.

У раздзеле 1.2. ***"Дынаміка жанравай формы утопіі"*** паказваецца эвалюцыя жанравай формы ад утопіі да антыутопіі.

Развіццё утапічнага і антыутапічнага мыслення на розных гістарычных этапах ішло паралельна, але не сінхронна. Аналіз ранніх утопій (Платон, Мор, Кампанела, Бэкан, і інш.) дазваляе зрабіць вывад: усе яны не змяшчаюць указанняў аб тым, як дасягнуць ідэальнага жыцця. Гэта была трэніроўка сацыялагічнага ўяўлення, а не праграма дзеянняў. Ужо ў іх прысутнічае антыутапічны элемент. Сапраўднае значэнне утопіі ў стварэнні новай формы – утапічнага рамана, папулярнага ў XVIII стагоддзі. Далейшае развіццё утапічных ідэй у XVIII і пачатку XIX стагоддзя адносіцца не да гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



літаратуры, а да гісторыі грамадска- палітычнай думкі. Утопія стала структурным кампанентам новай літаратуры. Найбольш гэта датычыцца навуковай фантастыкі. Пад канец XIX стагоддзя утопія зліваецца з ёю, набывае статус футуралагічнага прагнозу. У XX стагоддзі з'яўляюцца такія разнавіднасці утопіі, як "экаутопія", "эўпсіхея", "практопія". Класічная утапічная формула "дзіўнага свету" замяняецца спачатку футуралагічнай формулай "свету, лепшага за наш", а затым і "свету, які выжыве". У XX стагоддзі утопія трансфармуецца ў антыутопію, якая набывае статус самастойнай жанравай формы.

Антыутапічныя тэндэнцыі выспявалі ў літаратуры непрыкметна. Услед за развіццём літаратуры яны напрацоўвалі гратэскныя і сатырычныя формы адлюстравання жыцця, што адбывалася звычайна, як лічыць М.Бахцін, у рамках карнавальнай літаратуры, меніпійнай традыцыі. Сама праблема антыутопіі як самастойнай жанравай формы доўгі час не ставілася, бо не было афармленага канона, які можна пародыраваць, высмейваць, перайначваць, ад якога можна адштурхоўвацца. З'яўленне утопіі ў эпоху Адраджэння стала рэактывам, які дапамог крышталізаваць у літаратуры раствораныя антыутапічныя ідэі і тэндэнцыі. У творах, напісаных на познім этапе Адраджэння, выяўляецца антыгуманны характар новых капіталістычных адносін. Вядучым жанрам філасофскага тэатра становяцца драма (п'есы Шэкспіра) і раман з глыбокім грамадска-палітычным зместам. Пачынае актывізавацца антыжанр (парадыйны жанр), у нетрах якога і ўзнікае антыутопія. Антыутопія XVIII-XIX стст. у большасці выпадкаў разглядаецца як сатырычны і практычны каментарый да утапічных пабудоў. Пад канец XX ст. узнікае своеасаблівы жанр фантастычнага "рамана-папярэджвання" ("Машына часу" Г.Уэлса, "R.U.R" К.Чапека). Адлюстраванне ненатуральнай сацыяльнай рэчаіснасці прывяло ў XX стагоддзі да актывізацыі антыутопіі як жанравай формы.

Антыутопія мае сваю спецыфіку: перавага зместу над формай, раскрыццё тэхналогіі таталітарызму, арыентацыя на асобу, антрапацэнтрычнасць, персаналістычнасць. Асаблівую ўвагу аўтары звяртаюць на аналіз і вывучэнне спецыфікі грамадскай свядомасці, сацыяльнай псіхалогіі, пры якіх стала магчымым з'яўленне і існаванне таталітарызму і як формы дзяржаўнасці, і як ідэалогіі, паказ іх у гратэскных сатырычных мастацкіх вобразах. Вырашэнне вострых пытанняў сучаснасці вядзе да змястоўнай эвалюцыі антыутопіі. Яна ўключае ў сябе розныя ўстаўныя жанры, што збліжае яе з меніпійнай традыцыяй: устаўка пісем, аратарскіх прамоў, выступленняў, інструкцый, якія найбольш адэкватна адлюстроўваюць сутнасць таталітарызму. Важная рыса структуры – наяўнасць устаўных "агіяграфій" утапічных святых.

Асаблівасцю антыутопіі з'яўляецца дэсакралізацыя афіцыйных рытуалаў. Функцыя дзяржавы ў таталітарным грамадстве зводзіцца да забяспечвання іх выканання. Тут сацыяльная арганізацыя падобна да першабытнага ладу. Дзеянні і ўчынкі герояў запраграмаваны. Антыутапічнае грамадства абавязкова іерархічнае. Функцыянальныя асаблівасці жанравай

формы абумоўлены канцэптуальным падыходам да адлюстравання рэчаіснасці. У антыутопіі дамінуе прагнастычна-папераджальная функцыя і функцыя выкрыцця ("Мы" Я.Замяціна, "Вырату́й і памілуй нас, чорны бусел" В.Казько, "Ваўчыная яма" В.Быкава). У антыутопіі сацыяльны аспект выходзіць на пярэдні план. Яна пачынае адыходзіць ад прынцыпаў антыжанру. Скептычны рацыяналізм у творах Замяціна, Хакслі, Оруэла ў спалучэнні з сатырай і іроніяй скіраваны супраць тэхнакратызму сацыяльных і навуковых тэорый, якія перакрэсліваюць асобу.

Такім чынам, антыутопія - *адлюстраванне ў мастацкай літаратуры хібаў у пабудове грамадства паводле нейкага ідэальнага праекта, паказ разрыву паміж абвешчаным ідэалам і яго рэальным увасабленнем*. Будуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі класічных жанраў, якія выкрываюць адмоўныя бакі сацыяльнай сістэмы і парадыруюць пэўную утапічную канцэпцыю; ствараецца на бытавым і сацыяльна-палітычным матэрыяле; вызначаецца трагічнай танальнасцю, горкім сарказмам апавядання; карыстаецца сродкамі гратэску, пародыі, алегорыі, сатыры, пры гэтым звычайна выкарыстоўвае прыёмы кантамінацыі структурных элементаў, жанравай формы, алюзіі.

Антыутопія ў XX ст. адлюстроўвае сацыяльныя міфы постіндустрыяльнага грамадства. Выкарыстанне гратэскнай вобразнасці і фантасмагарычнай сімволікі раскрывае механіку духоўнага і фізічнага знішчэння і падаўлення асобы. У беларускай літаратуры пераход ад утопіі да антыутопіі акрэсліўся ў творах 20-30-х гадоў М.Зарэцкага, П.Галавача, Я.Коласа, дзе назіраецца набліжэнне ўмоўных формаў да сацыяльна-бытавой рэальнасці, да "формаў самога жыцця".

Такім чынам, утопія і антыутопія сталі сродкам пазнання творчага патэнцыялу суб'екта культуры. Мэта і задачы даследавання спецыфікі утапічнага мыслення выходзяць за межы чыстай метафізікі, апісальнай і гістарычнай паэтыкі. Гэтую задачу можа і павінна вырашыць сучасная культуралогія. Уласцівы ёй прынцып халізму дазваляе рабіць шырокія культурфіласофскія абагульненні, не адрываючыся ад ТЭКСТУ як сістэмы артэфактаў.

У главе 2. **"Беларуская утопія: гісторыка-культуралагічны аспект"** даследуецца гісторыя утапічнага мыслення ў Беларусі, вызначаецца спецыфіка беларускай утопіі.

У раздзеле 2.1. ***"З гісторыі утапічнага мыслення ў Беларусі"*** акцэнтуецца ўвага на асноўных этапах развіцця беларускай утопіі ў XVI-XX стст., вызначаюцца асноўныя тыпы нацыянальнага утапічнага мыслення. Пачынальнікам утапічных ідэй у грамадска-палітычным і філасофскім жыцці Беларусі быў Ф.Скарына. Ён з'яўляўся прыхільнікам ідэі "вечнага міру", абвешчанага такімі асветнікамі, як А.Дантэ, Піка дэла Мірандола, Э.Ратэрдамскі, С.Франк. У прадмовах Ф.Скарыны няма падрабязна распрацаванага праекта ідэальнага грамадска-палітычнага ладу, але мы можам сцвярджаць, што тагачаснае феадальнае грамадства ў многім не адпавядала



ідэалам мысліцеля. На думку У.Конана, адной з утопій Ф.Скарыны з'яўляецца ўяўленне аб раннехрысціянскіх абшчынах як гарманічных камунах. Асноватворныя прынцыпы рэлігійна-філасофскіх поглядаў мысліцеля – гэта "паспалітае добрае", міласэрнасць, талерантнасць, у цэнтр увагі пастаўлена зямное жыццё, сацыяльна актыўная асоба. Далейшае развіццё утапічнага светапогляду звязана з Рэфармацыяй. Падтрымліваючы ідэі грамадзянскага міру і суіснавання розных станаў, С.Будны заклікаў да гуманізацыі сацыяльных адносін, прапаведаваў культ розуму і бараніў духоўную свабоду чалавека, адмаўляў разбуральныя ідэі. Ідэолагі левага крыла антытрынітарыяў Якуб з Калінаўкі, Марцін Чаховіч, Пётр Ганэзій выступалі з патрабаваннем карэннай перабудовы існуючага грамадства, устанаўлення на зямлі "царства божага". Жыццё ў першых хрысціянскіх абшчынах для іх з'яўлялася эталонам ідэальнага грамадства. Іх праграма была па форме рэлігійнай, містычнай, выступленне супраць прыгонніцтва складала найбольш рэальны элемент іх сацыяльнай дактрыны.

Такім чынам, у эпоху Рэфармацыі існавалі як хіліясцкія, левaрадыкальныя, падыходы да праблемы "царства Божага" на зямлі, так і ліберальна-дэмакратычныя.

Крызіс рэнесанснага гуманізму, характэрны для Еўропы канца XVI – пачатку XVII стст., праявіўся і ў грамадскай свядомасці Беларусі. Ідэалізаванае ўспрыняцце будучыні змяняецца паступовым усведамленнем трагізму, жыццёвых супярэчнасцей. Выявілася гэта ў рэлігійна-філасофскім накірунку нонадорантызму, сярод лідэраў якога вылучаўся Ю.Даманеўскі. "Залатым стагоддзем" у гісторыі чалавецтва ён лічыць жыццё ў вёсцы. Цэнтральнае месца ў сістэме яго поглядаў займае не сацыялогія, а этыка, якая прасякнута духам песімізму.

У першай палове XVII ст. назіраецца адыход ад актуальнай агульнадзяржаўнай сацыяльнай праблематыкі. У 1669 годзе Ян Сенеńскі заснаваў абшчыну ў мястэчку Ракаў Сандамірскага ваяводства. Асноўным прынцыпам утапічнага сацыябудаўніцтва становіцца адмова ад асабістай маёмасці. Яе ідэалы можна сустрэць і ў палітычнай літаратуры. Першай свецкай утопіяй у Беларусі было сачыненне Міхаіла Літвіна (Цішкевіча) "Пра норавы татар, літоўцаў і масквіцян" (Базель, 1615 г.). Пад "залатым стагоддзем" ён разумее "старыя добрыя часы" Вялікага княства Літоўскага.

У XVI-XVII ст. утапічную ідэю "вечнага міру" імкнуліся рэалізаваць шляхам аб'яднання праваслаўя і каталіцтва. Рэалізацыя утопіі-уніі ў жыцці прывяла хутчэй да здзейсненай антыутопіі. Нацыянальная ж ідэя, якая сфарміравалася ў XVI ст., была адсунута. Тым не менш ў XVIII ст. уніяцтва стала нацыянальнай рэлігіяй, ва ўлоніі якой сфарміраваліся пэўныя накірункі беларускай культуры.

Захапленне асветніцкімі ідэямі прывяло да стварэння ў XVIII-XIX стст. своеасаблівых "ідылій" у маёнтках і гарадах Беларусі. У асноўным наватворэнні адбываліся ў сферы адукацыі і культуры. Сацыяльныя пераўтварэнні насілі лакальны характар. Ліберальна-гуманістычная і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кансерватыўна-ахоўная арыентацыя на працягу стагоддзяў захоўвала беларускую культуру ад разбурэння яе сродкамі імперскай ідэалогіі і моды на нігілізм.

У XVIII-XIX стст. ідзе фарміраванне крытычных адносін да рэчаіснасці. Акрэсліваецца антыўтапічны элемент у развіцці грамадскай думкі, назіраецца пераход да рэвалюцыйнага дэмакратызму. Найбольш грунтоўная і поўная праграма пераўтварэння соцыума была створана К.Каліноўскім. Для яго светапогляду характэрны ідэі утапічнага сацыялізму і антыутапічнага мыслення.

У XIX ст. канчаткова афармляецца беларуская нацыянальная ідэя. Першае вербальнае афармленне яе зместу на беларускай мове знаходзім у дзейнасці Ф.Багушэвіча. Чалавека ён аб'яўляў цэнтральнай фігурай жыцця, падтрымліваў прынцып агульнай роўнасці, не мірыўся з сацыяльнай несправядлівасцю. Ф.Багушэвіч паказаў "рай", які абяцаў "заходнерусізм" пад апекай царызму, як шлях да абсурду, як жыццё "ў астрозе". Трактоўка волі ў К.Каліноўскага, якая мела сацыяльна-эканамічны і маральны змест, узбагацілася ў Ф.Багушэвіча нацыянальным момантам.

Хуткімі тэмпамі нацыянальная ідэя развівалася ў культурна-грамадскім руху на пачатку XX ст. (А.Луцкевіч, В.Ластоўскі, Я.Лёсік). Ажыццяўленне утапічнага ідэалу, які акрэсліваецца ў барацьбе з канцэпцыяй "заходнерусізму", звязваецца з нацыяй як суб'ектам культуратворчага працэсу. Найбольш ярка нацыянальная ідэя выявілася ў творчасці Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, К.Чорнага, В.Быкава. Менавіта яны акрэслілі спецыфіку утапічнага мыслення беларусаў: моцная сувязь з рэаліямі навакольнай рэчаіснасці, успрыняцце яе як статычнага ладу. Істотны элемент адчування бяспекі для беларуса – устойлівасць свету.

Фактычна ўжо ў XIX ст. склаўся нацыянальны тып антыутапічнага мыслення (В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч), які сваё далейшае развіццё знайшоў у творчасці Я.Купалы, Я.Коласа, М.Гарэцкага, З.Бядулі, К.Чорнага, М.Зарэцкага, В.Быкава, В.Казько, і інш. На фарміраванне беларускай антыутопіі значны ўплыў зрабіла айчынная філасофская думка. Крытычны аптымізм У.Самойлы і рухомасць форм І.Канчэўскага адмаўлялі нігілістычныя адносіны да жыцця, выпрацоўвалі крытычны падыход у пазнанні рэчаіснасці. Беларускі шлях яны вызначылі як шлях творчасці новых форм сацыяльнага быцця. Доказ Самойлы: творчыя адносіны да жыцця не ёсць фізічнае знішчэнне зла, а ператварэнне яго ў дабро – надзея на нефатальны канец беларускай антыутопіі.

Змест беларускай антыутопіі дапаўняецца імкненнем раскрыць рэальны патэнцыял духоўнасці народа, сцвердзіць правільнасць і натуральнасць шляху выратавання – гарманічнае суіснаванне чалавечага і прыроднага космасаў.

У эпоху Асветніцтва былі закладзены асновы для вырашэння анталагічнай праблематыкі сродкамі новай беларускамоўнай літаратуры, заснаванай на трывалай фальклорнай аснове. Пераважна сялянская па сваіх каранях аксіялогія, прасякнутая ідэямі сацыяльнай роўнасці і свабоды,



развівалася і ўдасканальвалася на новым ўзроўні нацыянальнай духоўнай культуры. Гуманізм хрысціянскі змяніўся на гуманізм народніцкі, які эвалюцыянаваў у напрамак нацыянальна-вызваленчы. Гэты кірунак у сусветнай культуры XX ст. аказаўся найбольш плённым. Для утапічнага мыслення беларусаў у асноўным не характэрны крайне рэвалюцыянарысцкія імкненні.

У раздзеле 2.2. ***"Жанравыя формы утопіі"*** разглядаюцца такія формы беларускай утопіі як ідылія і "казкі жыцця", паказваецца дынаміка стылёвых тэндэнцый, вызначаецца спецыфіка утапічнага мыслення беларусаў.

Пачынаючы з XIX ст., элементы утопіі ўвасабляюцца ў мастацкай літаратуры, калі ў рамантызме стала папулярнай ідэя вяртання да "залатога стагоддзя". На развіццё утопіі аказала ўплыў і Асветніцтва XVIII ст. Ідэал ідылічнага суіснавання добрага адукаванага пана і паслухмянага працавітага селяніна раскрыты ў творах У.Сыракомлі, А.Плуга, Я.Чачота, В.Дуніна-Марцінкевіча. Блізкасць ідыліі да утопіі пацвярджаецца падабенствам жанравай формы. Пераважае аднолькавы прынцып тыпізацыі, героі пазбаўлены індывідуальных асаблівасцей, чалавечыя характары паказваюцца статычна, падкрэслены дыдактызм, прадугледжваецца апісальнасць, запаволенасць, імкненне зафіксаваць каштоўнасць імгнення. Наяўнасць канфлікту ў паэме-ідыліі адрознівае яе ад бесканфліктнай утопіі, дзе зло перамаглі ў мінулым. Тэндэнцыю да ідыліі мела найперш сялянская паэзія. Гэтым тлумачыцца наяўнасць ідылічных элементаў, матываў, вобразаў у беларускай літаратуры – арганічнага кампанента ў сістэме каштоўнаснага пазнання. Сведчаннем таму з'яўляюцца такія шэдэўры XX ст., як "Яна і я" Я.Купалы, "Новая зямля" Я.Коласа. Беларуская утопія XX ст. не дае рэцэптаў, яна раскрывае магчымасць, вераемнасць "новай зямлі". Адбываецца сінтэз двух структур: утопіі і антыутопіі.

Праблему будучыні Я.Колас вырашае і ў "Казках жыцця". Не аспрэчваючы несумненную грунтоўнасць даследаванняў Ю.Пшыркова, А.Семяновіча, В.Жураўлёва, І.Навуменкі, І.Чыгрына, А.Лойкі, мы лічым гэтыя творы Я.Коласа тыпалагічна блізкімі ў жанравых адносінах да рэалістычнай ідыліі. Яны – вышэйшая ступень у яе развіцці. Да рацыяналістычна ўнармаванай утопіі "казкі жыцця" не падобныя: усе яны падзейныя, дынамічныя, дыдактычныя.

Для твораў з афіцыйнай утопіяй 20-30-ых гадоў характэрны супрацьстаянне і сімбіёз афіцыйнага і традыцыйна-народнага стыляў. Праблема стылю – адна з важных і спрэчных і на сучасны момант, калі паўстала пытанне пошуку спосабаў культуратворчай дзейнасці. У стылях не толькі фіксуюцца стадыі развіцця культуры, але і супастаўляюцца, параўноўваюцца супрацьлеглыя інтэнцыі. Мэтазгодна разглядаць стыль як спосаб жыццядзейнасці сумарнага і індывідуальнага суб'ектаў. Найбольш выразна прасочваецца барацьба стыляў у творах пра калектывізацыю "Падарожжа на новую зямлю", "Лісты ад знаёмага" М.Зарэцкага, "Адшчапенец" Я.Коласа, "Спалох на загонах" П.Галавача. Традыцыйна-народны стыль арыентаваўся на народную утопію: жыццё на зямлі і ёсць казка. Заземленасць, імкненне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвердзіць неабходнасць гарманічных адносін паміж прыродай і соцыумам, апаэтызаваны побыт - гэтыя каштоўнасці супрацьстаўляюцца ідэалогіі таталітарызму.

Творы з афіцыйнай утопіяй – выкананне ў пэўнай меры ідэалагічнага заказу. Супярэчнасці і калізіі перыяду ломкі векавых традыцый, руйнаванне асноў сялянскага жыцця набываюць тыповы характар. Характэрныя структурныя кампаненты - прыезд упаўнаважанага з горада, экскурсія ў калгаснае эльдарада. Дзейснымі з'яўляюцца прыёмы эпісталы, допісу, гратэску, сатыры, няўласна-простай мовы. Афіцыйная утопія і антыутопія карыстаюцца тымі ж моўнымі сродкамі, толькі з рознымі мэтамі: каб паказаць абсурд таталітарнага ладу – антыутопія, каб правесці ў творы ідэалогію гэтага ладу – творы з афіцыйнай утопіяй. Іх структура не заўсёды і не поўнасцю адпавядае паэтыцы утопіі. Адсутнічае свабода ў выбары сюжэтных рашэнняў.

Асобую ролю адыгрывае лірыка-публіцыстычны і спавядальны кампанент. Арыентацыя на народны ідэал разбурае афіцыйную утопію, янаператвараецца ў сваю супрацьлегласць: антыутапічная тэндэнцыя акрэсліваецца ўсё больш выразна. У далейшым яна аформіцца ў самастойную жанравую форму. Дэградацыю афіцыйнай утопіі назіраем у аўтарытарнай літаратуры 40-х – першай палове 50-х гадоў у творчасці М.Паслядовіча ("Святло над Ліпскам", 1950), П.Броўкі ("Калі зліваюцца рэкі", 1951), П.Пестрака ("Серадзібор", 1963). На наш погляд, вынікі супрацьстаяння можна акрэсліць як распад афіцыйнага стылю, яго дэградацыю. Пачынаўся пераход да трагедыйнага канону. Духоўная энергія грамадства канцэнтравалася на малой плошчы.

Утапічная прастора беларусаў – гэта прастора іх жыцця, вынас дзеяння за яе межы не характэрны. Ідэал трактуецца на матэрыяле рэальнага быцця з улікам штодзённых "жыццёвых клопатаў". У XX ст. вызначальнай рысай грамадска-філасофскай думкі і мастацкай культуры становіцца антыутапічнае мысленне.

Глава 3 - **"Антыутопія як жанравая форма утопіі ў беларускім гісторыка-культурным працэсе"** - паказвае эвалюцыю і раскрывае жанрава-стылёвыя асаблівасці беларускай антыутопіі.

У раздзеле 3.1. ***"Эвалюцыя жанравай формы антыутопіі"*** паказваецца дынаміка антыутопіі ў мастацкай літаратуры. Антыутапічны накірунак трагедыйнага гучання ў беларускай літаратуры ўзнік як заканамерная з'ява рэалістычнага адлюстравання жыцця. Заснаваная на сацыяльна-палітычным і бытавым матэрыяле, антыутопія стала фенаменальнай з'явай гісторыка-культурнага працэсу ў Беларусі XX ст. Антыутопія выводзіла аналітычную думку адразу за межы сацыяльна-бытавой свядомасці на ўзровень філасофскага асэнсавання быцця. Узнікшы ў нетрах антыжанру, яна прыступнічае і ў творчасці В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, К.Крапівы, М.Танка, І.Мележа, Я.Брыля і іншых пісьменнікаў, якія адчулі ўплыў вуснай сатырычнай прозы. Для беларускай літаратуры XX ст. наогул характэрна крытычнае стаўленне да існуючай сацыяльнай рэчаіснасці. Больш



выразна пачынае выкрышталізоўвацца антыутопія ў структуры сацыяльна-бытавога рамана. XIX ст. на Беларусі было эпохай смехавой культуры. У XX-м стагоддзі нацыянальная свядомасць аказалася здольнай стварыць у адрозненне ад гратэскна-сатырычнай утопіі антыутопію трагедыйнага гучання. Трансфармацыя "абяцанага раю" знайшла глыбокае адлюстраванне ў "Запісках Самсона Самасуя" А.Мрыя, "Вязьме" М.Зарэцкага, "Знаку бяды", "Аблаве", "Ваўчынай яме" В.Быкава. Асабліва выразна бачацца рысы антыутопіі ў рамане-антыутопіі М.Зарэцкага "Вязьмо" (1932). Гэта пачатак літаратурнай антыутопіі.

Аналіз унутранай будовы твораў М.Зарэцкага ("Вязьмо"), В.Быкава ("Знак бяды", "Аблава", "Ваўчыная яма"), В.Казько ("Выратуй і памілуй нас, чорны бусел"), В.Гігевіча ("Доказ ад процілеглага", "Карабель") дазваляе аднесці іх да жанравай формы антыутопіі. Асноўны матыў твораў – выкрыццё таталітарызму. Адметнай катэгорыяй з'яўляецца шлях, спрадвечны вобраз-архетып нашай культуры. Аўтары папярэджваюць: нельга абыякава ставіцца да сваёй дзяржавы, незалежнасці, таму што гэта можа прывесці да аднаўлення таталітарнага рэжыму. Ухіленне ад натуральнага, вызначанага прыродай шляху пагражае будучыні нацыі. Антыутопія дае адказ на спецыфічнае для беларускага менталітэту пытанне: куды мы ідзем? Няздольнасць рэальна ўспрымаць і ацэньваць мінулае і сучаснасць прыводзіць да парадокса: "ваўчыная яма" – заканамерны вынік сацыяльна-палітычнага развіцця таталітарызму. Характэрны для антыутопіі і матыў пошуку праўды, ісціны. Дадзеная жанравая форма плённа карыстаецца ўстаўнымі канструкцыямі (казка, прытча, сны), якія нясуць вялікую сэнсавую нагрузку. Заканамерны ў творах-антыутопіях пра калектывізацыю такія структурныя элементы, як агляд гаспадарак, паходы па хатах, прыезд пасланца партыі з раёна. Мастацкія сродкі: гратэск, сімволіка, алегорыя, іронія, элементы фантастыкі, фантасмагорыя, пародыя – як правіла ўзмацняюць трагедыйнае гучанне твораў. Характэрныя асаблівасці мовы – выкарыстанне ўрыўкаў з газет, шматлікіх лозунгаў, заклікаў. Узбагачае антыутопію і ўжыванне навуковых паняццяў, тэрмінаў, формул, каментарыяў, заўваг (В.Гігевіч). Увага да няўласна-простай мовы дазваляе выразіць напружанне, падкрэсліць трагізм чалавека, яго адзіноту. Трагічная канцоўка становіцца заканамернай у антыутопіі. Гэтым аўтар як бы спыняе бег жыцця, фіксуе імгненне, якое прасвятляе людзей і становіцца пачаткам абуджэння асобы і канцэнтрацыі яе духоўных сіл. Функцыянальная адметнасць беларускай антыутопіі выявілася ўжо ў рамане В.Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел", дзе намецілася тэндэнцыя памяншэння папераджальнай функцыі і ўзмацнення выкрыцця і асуджэння. Асабліва дзейснай застаецца аповесць-антыутопія, хаця апошні час назіраецца актывізацыя падкрэслена лакалізаванага апавядання-антыутопіі (В.Быкаў). У беларускай літаратуры антыутопія напрыканцы XX – пачатку XXI стст. - дзейсная, выкрывальная, папераджальная сіла, сродак дэсакралізацыі сацыяльнай міфалогіі. Яна стала мастацкай формай філасофскага дыскурсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Задача раздзела 3.2. "***Хранатоп і тыпаж беларускай антыутопіі***" заключаецца ў вызначэнні спецыфікі хранатопу - "уваходжання ў сферу сэнсаў" (М.Бахцін) - і раскрыцці семантыкі вобразаў антыутапічнага апавядання.

Надзейным сродкам фарміравання творчага духу нацыі, асобы як этычна творчай адзінкі сталі хранатоп і тыпаж у літаратуры. Топіка беларускай антыутопіі не з'яўляецца нечым прынцыпова іншым у параўнанні з топасамі сацыяльна-бытавога рамана, драматургіі, філасофскай лірыкі. Новая ступень абагульнення дасягаецца не знешнімі праявамі імпрэсіяніcцкага і экспрэсіяніcцкага стыляў, а прывядзеннем вобраза да першаснага значэння метадам рэдукцыі.

Найбольшую сэнсавую нагрузку ў антыутапічным апавяданні нясуць топасы – апазнавальныя знакі культурнай прасторы. Дынаміка іх семантыкі мае свае вытокі ў класічных творах беларускай літаратуры (творы Я.Купалы, М.Зарэцкага, В.Быкава, В.Казько, В.Гігевіча). Культурная прастора ў антыутопіі звужаецца да памераў міжпланетнага карабля, а потым - ямы. Удакладненне месца – гэта акцэнт на істотным.

У творах-антыутопіях прасочваецца традыцыйнасць тыпажу, характэрнага для беларускай літаратуры ўвогуле (вобраз старых людзей – дзядоў, жанчыны, нацыянальнага героя, праўдадыра). У "Ваўчынай яме" В.Быкава дзейнічаюць новыя персанажы антыутапічнай рэчаіснасці: бомж, дэзерцір, гандляры наркотыкамі, марадзёры. Логіка быцця ў сацыяльнай антыутопіі, гвалтоўны час, паказвае В.Быкаў, заўсёды вядзе да трагічнага фіналу. Ствараецца супрацьстаянне эпоха – чалавек. Жорсткія абставіны падаўляюць асобу, імкнуцца падначаліць яе створанай сітуацыі. У гэтай барацьбе паказваецца нязломнасць чалавечага духу, адстойваецца яго воля да самавыяўлення. Мінулае раскрываецца сваім дадатковым сэнсам у суадносінах да сённяшняй сітуацыі. Цяперашні час спыніўся, заканчваецца ў "яме".

Беларуская антыутопія выявілася ў розных жанравых мадыфікацыях (раман, аповесць, апавяданне). Вызначальным застаецца адзінства стылёвых, функцыянальных, структурных асаблівасцей, трагедыйны пафас дадзенай формы. Антыутопія сцвярджае неабходнасць выяўлення патэнцыялу асобы як адзін з шляхоў выратавання нацыі. Зварот да рэтраспекцыі дазваляе высветліць сутнасць сучасных падзей у гісторыка-культурным працэсе, пераасэнсаваць мінулы вопыт і зрабіць акцэнты на аксіялагічных крытэрыях, якія павінны стаць вызначальнымі ў новым тысячагоддзі. Прапанаваная У.Самойлам канцэпцыя "крытычнага аптымізму" знайшла ўвасабленне ў розных відах мастацкай культуры, найперш - у мастацкай літаратуры.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Адметнай рысай ХХ стагоддзя з'яўляецца з'ява, якая атрымала назву "нацыянальны і этнічны рэнесанс". Гэтая асаблівасць не асэнсавана належным



чынам у тэорыі утопіі. Дасягненні беларускіх даследчыкаў у галіне гісторыі культуры, філасофіі, літаратуразнаўства з'яўляюцца базай для больш паглыбленага раскрыцця утапічнага зместу, закладзенага ў такіх спецыфічных формах нацыянальнай утопіі, як ідылія, "казкі жыцця", антыутопія, афіцыйная утопія. Беларуская утопія ўзбагачае традыцыйныя формы і матывамі сацыяльнага супрацьстаяння. Не менш істотным кампанентам яе зместу з'яўляецца раскрыццё духоўных рэсурсаў асобы. Усё гэта дае падставы для ўдакладнення навуковай тыпалогіі утапічнага мыслення прынцыпам гістарызму. Замест прапанаваных К.Мангеймам чатырох тыпаў (аргіястычна-хіліясцкага, ліберальна-гуманістычнага, кансерватыўнага, сацыялістычна-камуністычнага) уводзіцца тры: аргіястычна-хіліясцкі, ліберальна-гуманістычны, кансерватыўны. Сацыялістычна-камуністычны тып разглядаецца як адна з мадыфікацый аргіястычнага хіліязму [2;3].

2. Аксіялагічная і эстэтычная ўзаемаабумоўленасць утопіі і антыутопіі, узаемапранікненне іх структурных элементаў прывяло да ўзнікнення ў ХХ ст. інтэграванай жанравай формы. Дзеля гнасеалагічнай раўнавагі неабходна разглядаць утопію ў непарыўнай сувязі з антыутопіяй. Стымул іх стварэння – незадавальненне існуючым соцыумам. Яны заўсёды накіраваны на змену ўжо здзяйснёнага і дзеючага парадку рэчаў. Не прымаючы заганы рэальнага грамадства, утопія стварае ідэальныя дзяржавы, якія адпавядаюць жаданаму эталону. Антыутопія (негатыўная утопія) як жанравая форма жорстка выкрывае, асуджае негатыўныя праявы жыцця. Сувязь утопіі і антыутопіі пацвярджаецца спалучэннем у адной структуры рознанакіраваных кампанентаў. Утапічны ідэал, ("казка жыцця") - абавязковая структурная адзінка антыутопіі [2;3;4;5].

3. Канстатуецца, што аргіястычна-хіліясцкая ідэя і ліберальна-гуманістычная не сталі вызначальнымі ў нацыянальнай утопіі. Характэрным для утапічнай свядомасці беларусаў з'яўляецца кансерватыўны яе тып, арыентаваны на захаванне традыцыйных каштоўнасцей, на гарманічнае суіснаванне сацыяльнага і прыроднага космасаў. Перавага эвалюцыянізму над рэвалюцыянарызмам праявілася ў рэлігійнай талерантнасці. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага было ажыццёўлена па прынцыпу "старыны не рухаці, навіны не ўвадзіці". Пры ўсёй значнасці кансерватыўнага тыпу, трэба, аднак адзначыць, што яму ўласціва пэўная інертнасць. Супрацьстаянне афіцыйнай і народнай утопіі знайшло адлюстраванне найперш у мастацкай літаратуры. Інтэнцыя да захавання традыцыі і насычэння яе новай семантыкай выразна бачыцца ў такіх жанравых формах, як ідылія, "казка жыцця", прытча, антыутопія, у якіх назіраецца з'ява кантамінацыі і сінтэзу кагнітыўнага, маральна-этычнага і эстэтычнага зместу, закладзенага ў тэксце [3;6;7].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

4. Сцвярджаецца, што па сваёй сутнасці утопія і антыутопія – формы рэалістычныя. Акрамя мастацкай, яны выконваюць і духоўна-практычную функцыю. Вялікія сацыяльныя утопіі вызначаюць стыль мыслення, адкрываюць новыя інтэлектуальныя перспектывы і адлюстроўваюць канфліктнае напружанне паміж ідэалам і рэчаіснасцю. Беларуская утопія паэтызуе зямное жыццё. Мэта антыутапічных твораў не толькі крытыка пабудаванага утапічнага грамадства, але і паказ фарміравання аксіялогіі будучага. Антыутопія аналізуе папярэдні вопыт, неабходны для актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці. Пападраджальная функцыя ў творах дадзенай жанравай формы канца XX стагоддзя памяншаецца, акцэнт робіцца на дэсакралізацыі сацыяльнай міфалогіі. Выкрыццё і асуджэнне тэхналогіі таталітарызму дапаўняецца паказам летаргіі духоўнага жыцця, якая разбурае культурны вопыт нацыі, дэгуманізуе сацыяльныя працэсы. Беларуская утопія і антыутопія ў XX стагоддзі найперш выяўляе рэальныя культурныя рэсурсы нацыі, асобы, стымулюе сацыяльна-палітычную актыўнасць, жыццядзеянне суб'екта [1;8].

5.Тыпаж і харанатоп антыутопіі выконваюць культуратворчую функцыю, прасякнуты інтэнцыяй тварэння свету. Традыцыйным для антыутапічных твораў беларускай літаратуры становіцца лакалізацыя хранатопу, які адлюстроўвае напружанне актуальнага часу.

Звужэнне часова-прасторавых парамераў у антыутопіі суправаджаецца ўзрастаннем сэнсатворнага патэнцыялу структуры ў цэлым і асобных яе кампанентаў. Законы агульначалавечага быцця адлюстроўваюцца на "пятачках". Крытэрыем ацэнкі тыпаў і характараў з'яўляецца іх здольнасць да гуманістычнай самарэалізацыі [9].

6. Вызначаецца, што ў якасці суб'екта культуратворчай дзейнасці становіцца ў сучаснай сітуацыі нацыя і эквівалентная ёй асоба. Антыутопія дае канкрэтную ацэнку сучаснаму патэнцыялу народа, паказвае шляхі яго рэальнага самасцвярджэння. Традыцыі утопіі і антыутопіі ў XX стагоддзі аказаліся жыццястойкімі ў дастатковай меры, каб супрацьстаяць націску з боку нарматыўных установак і моды. Ва ўмовах нігілістычнага стаўлення да нацыянальнай мовы і культуры беларуская утопія і антыутопія сталі формай паглыбленага філасофскага спасціжэння сутнасці эпохі, сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Крытычная ацэнка сацыяльнага быцця суправаджаецца фарміраваннем механізмаў духоўнай самарэгуляцыі, пачуцця індывідуальнай годнасці, адказнасці за існуючы стан рэчаў [2; 6; 8].



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ

### Артыкулы

1. Сухоцкая Т.Ф. Жанравая спецыфіка беларускай антыутопіі: Да пастаноўкі пытання // Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. – 1996. — № 4. – С. 38-41.

2. Сухоцкая Т.Ф. Супрацьстаянне стыляў: афіцыйнага і традыцыйна-народнага // Бел. мова і літ. – 1998. — № 3. – С. 110-122.

3. Сухоцкая Т.Ф. Ідылія і "казкі жыцця" як спецыфічныя нацыянальныя жанры ў фарміраванні утапічнай свядомасці беларусаў // Адукацыя і выхаванне. – 1998. — № 4. – С. 17-23.

4. Сухоцкая Т.Ф. У розных жанравых мадыфікацыях: (Да праблемы тыпалогіі жанравай формы антыутопіі) // Грамадазнаўчыя навукі: метадалогія, праблемы, перспектывы: Штогоднік навук. даслед. / Бел. дзярж. пед. ун-т. Каф. грамадзн. навук. – Мінск, 2001. — Вып. 1. – С. 166-170.

### Тэзісы дакладаў і матэрыялы выступленняў

5. Сухоцкая Т.Ф. Некаторыя аспекты эвалюцыі антыжанру ў беларускай літаратуры // Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа: Зб. матэрыялаў рэсп. навук. канф., 23-24 крас. 1998 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. Мазыр. дзярж. пед. ін-т; Гал. рэд. Т.М.Казачэнка. – Мазыр, 1998. – С. 325-331.

6. Сухоцкая Т.Ф. Асветніцкая накіраванасць беларускай антыутопіі // Беларускае Асветніцтва: Вопыт тысячагоддзя: У 2 кн.: Матэрыялы Міжнар. кангр., Мінск, 20-21 кастр. 1998 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т; Рэдкал.: У.А.Васілевіч і інш. – Мінск, 1998. – Кн. 1. – С. 68-70.

7. Сухоцкая Т.Ф. Утапічныя ідэі ў творчасці беларускіх рамантыкаў XIX стагоддзя // Вечныя праблемы і вобразы ў творчасці Адама Міцкевіча: Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-тэарэт. канф. "Асоба і творчасць А.Міцкевіча ў кантэксце сусвет. літ." / Брэсц. дзярж. ун-т; Навук. рэд. У.А.Сенькавец. – Брэст, 1998. – С. 466-471.

8. Сухоцкая Т.Ф. Беларуская антыутопія як кампанент у змесце культуралагічнай падрыхтоўкі // Обществоведение в системе современного высшего образования: новые концепции, подходы в теории, методологии и методике преподавания: Тез. докл. респ. науч. конф., 23 апр. 1999 г.: В 2 ч. / М-во образования Респ. Беларусь. Бел. гос. пед. ун-т. – Минск, 1999. – Ч. 2. – С. 121-122.

9. Сухоцкая Т.Ф. Тыпаж і хранатоп беларускай антыутопіі // Беларускае Асветніцтва: Вопыт тысячагоддзя: У 3 кн.: Матэрыялы II Міжнар. кангр., Мінск, 17-19 мая 2000 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т; Гал. рэд. А.У.Лугоўскі. – Мінск, 2001. – Кн. 3, ч. 1. – С. 135-140.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РЭЗЮМЕ

**СУХОЦКАЯ Таіса Фёдараўна**

**ТЫПЫ І ФОРМЫ УТОПІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ (НА МАТЭРЫЯЛАХ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ І МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XVI-XX СТ.)**

***Ключавыя словы:*** утопія, антыутопія, ідылія, "казка жыцця", афіцыйная утопія, утапічны ідэал, тып утапічнага мыслення, хранатоп.

***Аб'ектам даследавання*** з'яўляецца утопія ў матэрыялах беларускай грамадскай думкі і ў творах мастацкай літаратуры XVI-XX стст.

***Прадмет даследавання*** – працэсы станаўлення і развіцця утопіі як тыпу мыслення і літаратурнай формы яе выражэння ў грамадскай думцы і мастацкай літаратуры.

***Мэта працы*** – выяўленне значэння сутнасці, спецыфікі тыпаў утапічнага мыслення і жанравых формаў утопіі ў беларускай культуры.

Даследаванне праведзена з выкарыстаннем аналізу, сінтэзу, сістэмнага падыходу ў адзінстве з гісторыка-тыпалагічным, параўнальна-гістарычным і метадам герменеўтыкі.

У дысертацыі атрыманы навукова абгрунтаваныя характарыстыкі форм беларускай культуры – утопіі і антыутопіі, устаноўлены крытэрыі размежавання жанравых формаў утопіі і ідыліі, утопіі і "казак жыцця", антыутопіі ў мастацкай літаратуры. У навуковы ўжытак па праблеме утопіі ўведзены вялікі пласт мастацкай літаратуры ў інтэграцыі з грамадскай думкай.

Атрыманыя вынікі могуць паслужыць тэарэтычнай базай для далейшага даследавання па праблеме утопіі і пры вывучэнні гісторыка-культурнага працэсу.





## РЕЗЮМЕ

**СУХОЦКАЯ Таисия Федоровна**

**ТИПЫ И ФОРМЫ УТОПИИ В БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЕ (НА МАТЕРИАЛЕ ОБЩЕСТВЕННОЙ МЫСЛИ И ХУДОЖЕСТВЕННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ XVI-XX ВВ.)**

***Ключевые слова:*** утопия, антиутопия, идиллия, "сказки жизни", официальная утопия, утопический идеал, тип утопического мышления, хронотоп.

***Объектом исследования*** является утопия в материалах белорусской общественной мысли и в произведениях художественной литературы XVI-XX вв.

***Предмет исследования*** – процессы становления и развития утопии как типа мышления и литературной формы её выражения в общественной мысли и художественной литературе путем выделения типов утопического мышления и характерных форм его выражения.

***Цель работы*** – выявление значения сущности, специфики типов утопического мышления и жанровых форм утопии в белорусской культуре.

Исследование проведено с использованием анализа, синтеза, системного подхода в единстве с историко-типологическим, сравнительно-историческим и методом герменевтики.

В диссертации получены научно обоснованные характеристики форм белорусской культуры – утопии и антиутопии, установлены критерии разделения жанровых форм утопии и идиллии, утопии и "сказок жизни", антиутопии в художественной литературе. В научное употребление по проблеме утопии введен большой пласт художественной литературы в интеграции с общественной мыслью.

Полученные итоги могут послужить теоретической базой для дальнейшего исследования по проблеме утопии и при изучении историко-культурного процесса.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Taisiya F. SUKHOTSKAYA**

**TYPES AND FORMS OF UTOPIA IN BELARUSIAN CULTURE (BASED ON THE MATERIALS OF BELARUSIAN SOCIAL THOUGHT AND LITERATURE OF XVI-XX CENTURIES)**

***The key words:*** utopia, anti-utopia, idyll, "tales of life", official utopia, utopian ideal, type of utopian thinking, chronotop.

***The object of research*** is utopia in the materials of belarusian social thought and Literature of XVI-XX centuries.

***The subject of research*** is the process of coming into being and development of utopia as the type of utopian thinking and typical form of its expression in social thought and literature.

***The aim of research*** is to single out and substantiate the importance essence and specific character of utopian thinking and utopian forms of genre in belarusian culture.

The research was made using the analysis and sunthesis of systematic approach together with the following methods: historico-typological, historico-comparative, the method of hermeneutics.

In the thesis we obtained the following results: we got the science grounded characteristics of the forms of belarusian culture – utopia and anti-utopia, we determined the criteria of difference between the forms of genre of utopia and idyll; utopia and "tales of life", anti-utopia and literature; an important layer of literature together with belarusian social thought was put in the use of science.

The obtained results could serve as the theoretic basis for the further investigating the problem of utopia and in studying historico-cultural process.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Навуковае выданне

**Сухоцкая Таіса Фёдараўна**

**Тыпы і формы утопіі ў беларускай культуры (на матэрыялах грамадскай думкі і мастацкай літаратуры XVI—XX ст.)**

на ат … orii
па спе… туры




Падпісана ў друк 02.05.2002. Фармат 60×84 1/16. Папера пісчая. Ум. друк. арк. 1,0. Тыраж 100 экз. Заказ 197. Бясплатна.

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.98. 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18

*Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка*
ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ, Ліцэнзія ЛП № 486 ад 02.04.2002 г.
220007, г. Мінск, вул. Магілёўская, 37